УДК 0811.161.3637.013

# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ І БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК АСНОВА ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ

В. В. ПАНЕЖА
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
Магілёў, Беларусь

Тэма духоўнага, маральнага, патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення заўсёды з'яўлялася важнай, актуальнай і надзённай. Чаму? Адказ даволі просты. Патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне вызначае будучыню народа, а яго падмурак закладваецца з дзяцінства. Працуючы ў гэтым напрамку, даволі важным з'яўляецца стварэнне ўмоў, якія садзейнічаюць раскрыццю маральнага і духоўнага патэнцыялу маладога пакалення, далучэнне яго да вытокаў традыцый і культуры народа.

Культура – складаная, шматпланавая з'ява, якая пранізвае ўсе сферы жыцця і дзейнасці грамадства і чалавека. Інакш кажучы, культура – «душа» грамадства, аснова духоўна-маральных арыенціраў грамадзян, іх нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму. Стагоддзямі з пакалення ў пакаленне перадаюцца багатыя духоўныя каштоўнасці, якія праслаўляюць маральную сутнасць чалавека. У іх раскрываюцца высокія ідэалы дабра і справядлівасці, павагі да культуры і традыцый іншых народаў.

Знаёмства з культурай, багатай літаратурнай спадчынай, гераічнай гісторыяй і традыцыямі роднага краю, – аснова грамадзянска-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення. Зразумела, што без захавання культурных каранёў, культурных традыцый чалавек страчвае сувязь з гісторыяй роднай зямлі.

У рамках падпісанай дамовы паміж Беларуска-Расійскім універсітэтам, Новасібірскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам, Новасібірскім Цэнтрам беларускай культуры на працягу 2018–2022 гг. праведзены шэраг мерапрыемстваў, накіраваных не толькі на папулярызацыю беларускай мовы і нацыянальных традыцый, але і на захаванне духоўнай спадчыны беларускага народа. Перш за ўсё, гэта лекцыі і семінары, анлайн-семінары, анлайн-віктарыны для прадстаўнікоў беларускіх грамадскіх аб'яднанняў і творчых калектываў г. Новасібірска і Новасібірскай вобласці, новасібірцаў, якім цікавая беларуская мова і беларуская культура; стварэнне сумесных праектаў, галоўнай мэтай якіх павінна быць:

– далучэнне маладога пакалення да вытокаў продкаў, выхаванне любові і павагі да гістарычнай радзімы;

– захаванне этнічнай культуры беларусаў, якія пражываюць у Новасібірскай вобласці.

Вялізную працу ў гэтым напрамку праводзіць Новасібірскі Цэнтр беларускай культуры. Толькі за апошнія два гады сумесна з Цэнтрам беларускай культуры быў праведзены шэраг цікавых, значных мерапрыемстваў, накіра-

ваных на папулярызацыю не толькі беларускай мовы, але і культуры беларускага народа ў цэлым. Сярод іх анлайн-віктарына, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры, аднаго са стваральнікаў нацыянальнай мастацкай літаратуры, паэта Максіма Багдановіча.

Адным з апошніх яркіх мерапрыемстваў сталі Дні беларускай культуры Новасібірскай вобласці, якія прайшлі з 12 па 17 кастрычніка 2022 г. у Доме нацыянальных культур ім. Г. Д. Завалокіна.

У рамках Дзён беларускай культуры ў Цэнтры беларускай культуры і Навуковай бібліятэцы ім. Г. П. Лышчынскага Новасібірскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта прайшлі семінар і майстар-клас «Слаўныя сыны зямлі беларускай» (мал. 1 и 2), прысвечаныя 140-годдзю з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры, народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.



Мал. 1. Цэнтр беларускай культуры. Удзельнікі семінара




Мал. 2. Новасібірскі тэхнічны ўніверсітэт. Удзельнікі семінара

Семінар – гэта аўтарскі праект старшага выкладчыка Беларуска-Расійскага ўніверсітэта Валянціны Васільеўны Панежа. Падчас працы семінара ўдзельнікі мелі магчымасць пазнаёміцца з творчасцю класікаў беларускай літаратуры, прыняць удзел у літаратурнай віктарыне «Шляхамі Янкі Купалы і Якуба Коласа». Падчас Дзён беларускай культуры адбылося адкрыццё фотавыставы «Беларускі характар» (фота Андрэя Бауліна). Гэта фотапраект аб беларускіх мужчынах, якія ўнеслі значны ўклад не толькі ў развіццё Новасібірскай вобласці, але і ў захаванне беларускай культуры, традыцый беларускага народа.

Гэта сведчанне таго, што старэйшае пакаленне беларусаў надае вялікую ўвагу духоўна-маральнаму выхаванню падрастаючага пакалення, імкнецца перадаць моладзі культуру сваіх продкаў, прывіць павагу да культуры розных нацыянальнасцей.

На адкрыцці фотавыставы прысутнічала старшыня культурнай аўтаноміі беларусаў Надзея Аляксандраўна Санцэвіч, якая ўручыла героям фотапраекта памятныя календары з выявай кожнага ўдзельніка.

Яркай і запамінальнай падзеяй Дзён беларускай культуры стаў святочны канцэрт «Мелодыі Белай Русі». Музычныя калектывы і выканаўцы, сярод якіх «Белыя росы», «Званніца», «Завіруха», «Вясёлка», Анастасія Трубянкова, радавалі гасцей свята гучаннем пявучай беларускай мовы.